9. Los Angeles Times. – 1941. – June 22. – P. 1.
10. New York Times. – 1941. – June 22. – P. 18.
11. Pittsburgh Press. – 1941. – June 22. – P. 48.
12. Portsmouth Times. – 1941. – June 24. – P. 1.
13. Pratt, J. Cordell Hull 1933–1944: in 2 vol. / J. Pratt. – New York : Cooper Square Pub., 1964. – Vol. 2. – 840 p.
14. San Francisco Examiner. – 1941. – June 24. – P. 1.
15. Sherwood, R. Roosevelt and Hopkins: An Intimate History / R. Sherwood. – New York : Grosset & Dunlap, 1950. – 1011 p.
16. Thayer, C. Bears in the Caviar / C. Thayer. – New York : Lippincott, 1951. – 303 p.
17. The Franklin Delano Roosevelt Library. Safe Files. – Box 5. Russian Divisions 6/24/41.
18. University of Vermont Libraries Special Collections. Edward C. Carter Collection. – Box 3. Folder 7. Russian War Relief and American Russian Institute: public file, 1941–1942.

Репозиторий БГУ

## ПОЛЬСКАЕ ПЫТАННЕ ВА ЎЗАЕМАДАЧЫНЕННЯХ “ВЯЛІКАЙ ТРОЙКІ” ПАДЧАС ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Л.І. Ермаковіч (Баранавічы)***

1 верасня 1939 года фашысцкая Германія напала на Польшчу. У адказ на гэта ўрады Вялікабрытаніі і Францыі, якія былі звязаны з Польшчай пагадненнямі аб узаемадапамозе, 3 верасня аб’явілі вайну Германіі. Так пачалася Другая сусветная вайна.

Аднак рэальнай дапамогі Вялікабрытанія і Францыя Польшчы ў вайне з Германіяй, як вядома, не аказалі, і пад ударамі вермахта, да якога 17 верасня 1939 г. далучылася савецкая Чырвоная армія, польская дзяржава меней за чатыры тыдні была поўнасцю акупіравана і знікла з палітычнай карты Еўропы.

У такіх абставінах польскі ўрад адмовіўся легітымізаваць склаўшуюся з Польшчай трагічную сітуацыю, а сам падаўся ў эміграцыю: спачатку ад’ехаў у Румынію, пасля ў Францыю, а затым у Лондан, дзе і знаходзіўся на ўсім працягу Другой сусветнай вайны.

Урады Вялікабрытаніі і Францыі афіцыйна прызналі польскі ўрад у эміграцыі начале з Уладзіславам Сікорскім адзіным законным прадстаўніком інтарэсаў заняволенага польскага народа і працягвалі з ім адносіны на дыпламатычнай аснове. Францыя спыніла гэтыя адносіны пасля сваёй капітуляцыі перад Германіяй 22 чэрвеня 1940 г.

Цікава адзначыць, што пасля нападу фашысцкай Германіі на СССР, нягледзячы на іх сумесны падзел Польшчы, 30 ліпеня 1941 г. у Лондане было падпісана Пагадненне паміж СССР і польскім урадам, поводле якога савецкі ўрад прызнаў савецка-германскія дагаворы 1939 г. адносна тэрытарыяльных змен у Польшчы страціўшымі сілу. У сваю чаргу польскі ўрад

заявіў, што Польшча не звязана ніякімі пагадненнямі з якім-небудзь бокам, які накіраваны супраць Савецкага Саюза.

Гэтым пагадненнем аднаўляліся раней разарваныя дыпламатычныя адносіны, і ободвы ўрады ўзаемна абавязваліся аказваць адзін аднаму ўсялякую дапамогу і падтрымку ў вайне супраць гітлераўскай Германіі. У прыватнасці, урад СССР даў сваю згоду на стварэнне на савецкай тэрыторыі польскай арміі пад польскім камандаваннем пры аператыўным кіраўніцтве ёю з боку савецкага камандавання.

Згаворлівасць савецкага лідара І. Сталіна з польскім эмігранцкім урадам, яго адмова ад тэрытарыяльных змен у Польшчы, стаўшых вынікам германа-савецкага хаўруса, тлумачыцца катастрафічным развіццём падзей на савецка-германскім фронце, якое вымагала пошуку і задзейнічання любых знешнепалітычных магчымасцей для змяншэння пагрозы існаванню СССР.

Аб’яўленне Гітлерам 11 снежня 1941 г. вайны Злучаным Штатам Амерыкі надало сусветнай вайне сапраўды глабальны характар, паскорыла фарміраванне антыгітлераўскай кааліцыі, у якой дамініруючую ролю адыгрывала так званая “вялікая тройка”: СССР, ЗША і Вялікабрытанія на чале з іх лідарамі – І. Сталіным, Ф. Рузвельтам і У. Чэрчылем. Менавіта “вялікая тройка”, зыходзячы з аб’ектыўных рэалій і сваіх інтарэсаў ажыццяўляла ўзгодненую лінію па ўсіх пытаннях еўрапейскай палітыкі ваеннага часу, у тым ліку ў адносінах да польскага пытання, стрыжань якога складала пытанне аб палітычнай будучыні польскага народа.

Гістарычныя крыніцы сведчаць аб тым, што да пачатку 1943 г. польскае пытанне як істотны фактар ва ўзаемаадносінах кіраўнікоў трох вялікіх дзяржаў не ўзнікала. Аднак вясной 1943 г. нечакана наступіў востры крызіс у польска-савецкіх адносінах, які стаў вынікам так званай “катынскай справы”: выяўленнем нямецкімі акупацыйнымі ўладамі масавых пахаванняў польскіх вайскоўцаў у катынскім лесе пад Смаленскам, якія былі ўзяты ў палон Чырвонай арміяй у верасні 1939 г. Немцы ў гэтым злачынстве абвінавацілі Маскву, і польскі ўрад, паверыўшы ім, запатрабаваў ад савецкага кіраўніцтва расследавання па гэтай справе.

Са свайго боку савецкі ўрад у катэгарычнай форме адхіліў усе абвінавачванні ў свой адрас. З гэтай нагоды І. Сталін, які быў галоўным актарам катынскай трагедыі, у сваім пасланні У. Чэрчылю ад 21 красавіка 1943 г. цынічна пісаў, што распачатая нямецкімі фашыстамі паклёпніцкая кампанія з нагоды імі ж забітых польскіх афіцэраў у раёне Смаленска “была сразу же подхвачена правительством г. Сикорского и всячески разжигается польской официальной печатью”, і на падставе гэтага “Советское Правительство пришло к выводу о необходимости прервать отношения с этим правительством” [1, с. 145–146].

У выніку дадзенага інцыдэнта савецкае кіраўніцтва разарвала дыпламатычныя адносіны с польскім урадам у Лондане і аддало сакрэтны загад Цэнтральнаму і Беларускаму штабам партызанскага руху разброіць



Репозиторий ВГУ

дзейнічаўшыя на акупіраванай немцамі тэрыторыі Беларусі атрады Арміі Краёвай, якая падпарадкоўвалася польскаму ўраду ў эміграцыі. Сам яго кіраўнік – генерал У. Сікорскі – 4 ліпеня 1943 г. загінуў у загадкавай авіякатастрофе.

Пасля перамогі над немцамі ў бітве на Курскай дузе ў ліпені-жніўні 1943 г. у канчатковай перамозе над фашысцкай Германіяй савецкае ваенна-палітычнае кіраўніцтва ўжо не сумнявалася. Таму прыйшоў час падумаць аб механізмах палітычнага ўплыву і кантролю над народамі тых еўрапейскіх краін, якія будуць вызвалены Чырвонай арміяй у выніку яе будучага замежнага паходу. Першым такім механізмам уплыву менавіта на Польшчу стала стварэнне ў Варшаве 1 студзеня 1944 г. Краёвай Рады Нарадовай у процівагу польскаму эмігранцкаму ўраду у Лондане. У яе склад увайшлі польскія камуністы, звязаныя з Масквой, прадстаўнікі Польскай рабочай, сялянскай, сацыялістычнай, дэмакратычнай партый, Партыі працы, а таксама прадстаўнікі прафсаюзных арганізацый і беспартыйныя грамадска-палітычныя дзеячы. Старшынеі гэтай Рады быў абраны прадстаўнік Польскай рабочай партыі Баляслаў Берут. На сваім першым пасяджэнні Краёвая Рада Нарадова прыняла дэкларацыю аб саюзе з СССР у барацьбе з нямецка-фашысцкай Германіяй.

Утварэнне вышэйназванай Рады выклікала рэзкую адмоўную рэакцыю з боку эмігранцкага польскага ўраду і яго новага кіраўніка Станіслава Мікалайчыка, які заявіў аб непрызнанні Рады.

У выніку правядзення аперацыі “Баграціён” па вызваленні Беларусі Чырвоная армія 20 ліпеня 1944 г. выйшла на мяжу з Польшчай. Гэта дазволіла савецкаму кіраўніцтву ажыццявіць у аднабаковым парадку, без узгаднення з урадамі Вялікабрытаніі і ЗША, надзвычай важную палітычную акцыю: 21 ліпеня 1944 г. Краёвая Рада Нарадова ўтварыла ў Маскве Польскі камітэт нацыянальнага вызвалення (далей – ПКНВ), які па сутнасці стаў новым польскім урадам і які перахопліваў уладныя функцыі і паўнамоцтвы польскага эмігранцкага ўрада ў Лондане. Яго рэзідэнцыяй быў абраны г. Люблін. 26 ліпеня 1944 г. урад СССР і ПКНВ падпісалі пагадненне, паводле якога прызнавалася ўлада ПКНВ на вызваляемай Чырвонай арміяй польскай тэрыторыі.

Такое “двоеўраддзе” ніякім чынам не магло задаволіць кіруючыя колы Лондана і Вашынгтона. Аднак разумеючы, што ПКНВ, за спіной якога стаіць Савецкі Саюз, з’яўляецца палітычнай рэальнасцю, якую нельга ігнараваць і з якою неабходна лічыцца, У. Чэрчыль і Ф. Рузвельт імкнуліся дамагчыся ад І. Сталіна згоды на ажыццяўленне кантактаў абодвых урадаў дзеля збліжэння іх пазіцый і аб’яднання ўсіх дэмакратычных сіл на вызваленай польскай тэрыторыі, якія па-сяброўску настроены ў адносінах да СССР, ЗША і Вялікабрытаніі, І. Сталін фармальна даў на гэта згоду і нават сустрэўся ў Маскве з дэлегацыяй польскага эмігранцкага ўрада начале з Мікалайчыкам. Пасля гэтай сустрэчы ён пісаў Ф. Рузвельту, што ў яго “создалось впечатление, что Миколайчик не против того, чтобы нашлись пути к объединению поляков” [2, с. 162].



Репозиторий ВГУ

Наступныя падзеі яскрава паказалі, што ў планы савецкага кіраўніцтва не ўваходзіць аб’яднанне на дэмакратычнай аснове ўсіх дэмакратычных сіл Польшчы. Сталін абвінаваціў польскі ўрад у Лондане ў вядзенні злачыннай тэрарыстычнай работы супраць савецкіх салдат і афіцэраў на тэрыторыі Польшчы. Ён заявіў, што гэта адбываецца ў той час, калі ПКНВ дамогся вялікіх поспехаў “в укреплении польского государства и аппарата государственной власти на территории Польши” [2, с. 190–191]. У гэтых умовах, падкрэсліў І. Сталін у сваім лісце да Ф. Рузвельта ад 27 снежня 1944 г. “я должен откровенно сказать, что если Польский комитет национального освобождения преобразуется во Временное Польское Правительство, то … у Советского Правительства не будет серьезных оснований откладывать вопрос о его признании” [2, с. 190]. Адначасова ён заклікаў сваіх саюзнікаў прызнаць ПКНВ законным урадам Польшчы пасля таго, як ёнператворыцца ў Часовы ўрад Польшчы [2, с. 192].

Такой аднабаковай пазіцыі І. Сталіна кіраўнікі ЗША і Вялікабрытаніі не маглі нічога супрацьпаставіць, бо І. Сталін меў неабвержны аргумент у выглядзе савецкіх войскаў, якія “делали и делают все возможное для того, чтобы ускорить освобождение Польши от немецких захватчиков и помочь польскому народу в восстановлении свободы и в деле процветания его родины” [1, с. 293].

Рашэнне аб пераўтварэнні ПКНВ у Часовы ўрад Польскай Рэспублікі было прынята на VI сесіі Краёвай Рады Нарадовай, якая адбылася 31 снежня 1944 г. – 5 студзеня 1945 г. Гэты ўрад быў адразу прызнаны Вярхоўным Саветам СССР з-за яго прасавецкай арыентацыі. Але ён не быў прызнаны ўрадамі ЗША і Вялікабрытаніі, якія настойвалі на рэарганізацыі дадзенага ўрада шляхам уключэння ў яго новых членаў як з прадстаўнікоў польскай эміграцыі, так і з самой Польшчы. Такі агульны падыход на рэарганізацыю Часовага ўрада Польшчы быў замацаваны на Крымскай (Ялцінскай) канферэнцыі трох саюзных дзяржаў у лютым 1945 г.

Палітычная практыка не спраўдзіла надзеі на рэарганізацыю Часовага ўрада Польскай Рэспублікі на аснове ўзгодненага падыхода лідараў саюзных дзяржаў. Гэтаму заміналі розныя абставіны і найперш пазіцыя савецкага кіраўніцтва, якое катэгарычна настойвала на тым, каб рэканструкцыя Часовага ўрада Польшчы азначала не яго ліквідацыю, а менавіта яго рэканструкцыю шляхам яго пашырэння, пры гэтым ядром будучага польскага ўрада нацыянальнага адзінства павінен быць Часовы ўрад Польскай Рэспублікі. Да таго ж уключэнне ў склад новага ўрада новых яго членаў з ліку прадстаўнікоў польскай эміграцыі (эмігранцкага ўрада ў Лондане) і з самой Польшчы павінна было адбывацца пасля іх кансультацый з прадстаўнікамі польскага Часовага ўрада і з яго адабрэння. Невыкананне гэтай умовы, на думку І. Сталіна, можа быць успрынята ў Польшчы як зняважа польскага народа і як спроба навязаць Польшчы ўрад, створаны без уліку грамадскай думкі Польшчы [1, с. 373–374]. Акрамя таго, выклікаць

на кансультацыю з вызваленай Польшчы і Лондана патрэбна было толькі тых дзеячаў, якія на справе імкнуліся ўсталяваць сяброўскія адносіны паміж Польшчай і Савецкім Саюзам.

Зразумела, што пры такім падыходзе не існавала ніводнага шанца трапіць у новы аб'яднаны урад ніводнаму прадстаўніку з апазіцыйнымі поглядамі, з поглядамі, якія б адрозніваліся ад савецкага пункту гледжання на тэрытарыяльныя межы Польшчы, яе грамадска-палітычнае ўладкаванне і палітычную будучыню польскага народа.

Па-сутнасці разглядаемы план рэарганізацыі і стварэння аб'яднанага ўрада Польшчы, у якім былі б прадстаўлены галоўныя слаі польскага грамадства і які ўзяў бы на сябе абавязак правесці ў вызваленай Польшчы свабодныя выбары пры ўдзеле ўсіх антынацысцкіх партый, савецкім урадам быў заблакіраваны. Больш таго, І. Сталін абвінаваціў У. Чэрчыля і Ф. Рузвельта ў дзейнасці па стварэнні польскага ўрада, варожа настроенага да СССР [1, с. 403].

Такім чынам, надзеі лідэраў ЗША і Вялікабрытаніі на адраджэнне суверэннай, незалежнай і свабоднай Польшчы пры ўмове, што яна будзе дружалюбнай у адносінах да Савецкага Саюза, не спраўдзіліся. У гэтай сувязі У. Чэрчыль з засмучэннем і прыкрасцю напісаў І. Сталіну 28 красавіка 1945 г. наступныя радкі: "Не особенно утешительно заглядывать в будущее, когда Вы и страны, в которых Вы господствуете, плюс коммунистические партии во многих других государствах выстраиваются все по одну сторону, а те, кто объединяется вокруг народов, говорящих по-английски, и их союзников или доминионов – по другую сторону" [1, с. 407]. Магчыма, што гэтыя радкі азначаюць прадчуванне будучай "халоднай вайны".

*Источники и литература:*

1. Переписка Председателя Совета Министров СССР с президентами США и премьер-министрами Великобритании во время Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. : в 2 т. – Изд. 2-е. – М. : Политиздат, 1976. – Т. 1. Переписка с У. Черчиллем и К. Эттли (июль 1941 г. – ноябрь 1945 г.). – 472 с.
2. Переписка Председателя Совета Министров СССР с президентами США и премьер-министрами Великобритании во время Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. : в 2 т. – Изд. 2-е. – М. : Политиздат, 1976. – Т. 2. Переписка с Ф. Рузвельтом и Г. Трумэном. (авг. 1941 г. – дек. 1945 г.). – 327 с.

## ПОСТАВКИ ИЗ США В СССР ПО ЛЕНД-ЛИЗУ В 1943–1945 ГОДАХ. ФАКТОРЫ РАСШИРЕНИЯ СОТРУДНИЧЕСТВА

***С.М. Монин (Москва)***

Военно-экономическое сотрудничество СССР и США, пройдя в 1941–1942 годах этап становления и налаживания [3, с. 66–70; 4, с. 182–185], в 1943–1945 годах в целом успешно расширялось и крепло.



Репозиторий ВГУ